# Першыя крокі на шляху да фарміравання сістэмы савецкіх органаў улады на тэрыторыі Заходняй Беларусі восенню 1939 г.

*Дзядзюля Д. А., аспірант БДУ,*
*навук. кір. Коршук У. К., д-р гіст. навук, прафесар*

Падрыхтоўка да фарміравання новых органаў улады ў Заходняй Беларусі пачалася яшчэ да ваеннай аперацыі СССР супраць Польскай Рэспублікі. Для стварэння ў заходнім рэгіёне апарата НКУС і правядзення аператыўна-чэкісцкай работы, згодна загаду ад 8 верасня 1939 г., наркаму ўнутраных спраў БССР Л. Цанаве было даручана выдзеліць 50 работнікаў Упраўлення дзяржаўнай бяспекі НКУС БССР, а таксама 150 аператыўна-палітычных работнікаў Упраўлення памежнай і ўнутранай аховы НКУС БССР [3, 70–72]. Асноўнымі напрамкамі працы аператыўна-чэкісцкіх груп сталі выяўленне і арышты «контррэвалюцыйных элементаў», падбор і праверка работнікаў, канфіскацыя зброі ў мясцовага насельніцтва [4, 18].

Па меры руху савецкіх войскаў у населеныя пункты Заходняй Беларусі 17 верасня 1939 г., пад кантролем аператыўна-чэкісцкіх груп і партыйных работнікаў у ваяводствах, паветах і гарадах пачалі стварацца Часовыя ўпраўленні (часовыя органы ўлады), у склад якіх увайшлі прадстаўнікі Чырвонай Арміі (у асобе палітработнікаў), прадстаўнікі НКУС, былыя члены КПЗБ, а таксама найбольш аўтарытэтныя мясцовыя жыхары. У адпаведнасці з лістом сакратара ЦК КП(б)Б П. Панамарэнка ўжо да 25 верасня 1939 г. па ўсіх гарадах былі створаны Часовыя ўпраўленні, якія прыступілі да працы [4, 50]. На пасяджэнні Бюро ЦК КП(б)Б 2 кастрычніка 1939 г. былі зацверджаны наступныя старшыні Часовых упраўленняў: Беластоцкай вобласці – У. Гайсін, Віленскай – Я. Жылянін, Палескай – П. Калінін, Навагрудскай – П. Бандарэнка [6, 128].

ЦК КП(б)Б надаваў вялікую ўвагу працы Часовых упраўленняў і накіроўваў іх дзейнасць. Так арганізацыйна-інструктарскі аддзел цэнтральнага Камітэта складаў спісы з ліку партыйных і камсамольскіх работнікаў, т.з. «усходнікі», якія накіроўваліся з БССР на ўсе ключавыя пасады для працы сярод грамадзянскага насельніцтва. Дасланым работнікам належала ўся паўната ўлады на занятай тэрыторыі.

На новыя органы ўлады ўскладалася вялікая задача па злому старога дзяржаўнага апарату, першапачатковаму ўладкаванню жыцця рабочых і сялян, кіраўніцтву адміністрацыйнай, гаспадарчай і культурна-асветніцкай дзейнасцю. Так, напрыклад, Часовае ўпраўленне горада Кобрына і Кобрынскага павета мела наступную арганізацыйную структуру і аддзелы: харчовы,

прамысловы, фінансавы, аховы здароўя, народнай адукацыі, камунальны, палітасветы, сувязі, працы і інш. Першыя загады Часовага ўпраўлення, выдадзеныя адразу пасля ўступлення Чырвонай арміі ў горад, тычыліся здачы мясцовым насельніцтвам агнястрэльнай і халоднай зброі, якая знаходзілася як у асабістым, так і ў службовым карыстанні [2, арк. 8]. Услед за імі выходзілі іншыя пастановы: аб аднаўленні гандлю ў крамах і кіёсках, аб увядзенні ў абарот савецкага рубля па курсе адзін злоты да аднаго рубля [1, ст. 47].

Таксама можна вылучыць вядучую ролю Часовых упраўленняў у арганізацыі сельскіх камітэтаў у сельскай мясцовасці. У іх склад уваходзілі пераважна найбяднейшыя пласты насельніцтва: беднякі, батракі, часткова сярэднякі. Яны абіраліся на агульным сходзе сёлаў адкрытым галасаваннем. Не чакаючы заканадаўства новай улады, сялянскія камітэты бралі на сябе ўлік маёмасці памешчыкаў, асаднікаў, дзялілі памешчыцкую і царкоўную зямлю сярод насельніцтва. Нярэдка ў дзейнасці прадстаўнікоў сялянскіх камітэтаў заўважаліся шматлікія парушэнні і незаконныя дзеянні, што гаворыць аб нядобрасумленным выкананні абавязкаў некаторых прадстаўнікоў Часовых упраўленняў [5, ст. 133].

Варта адзначыць, што Часовыя ўпраўленні і сялянскія камітэты дзейнічалі ў пераходны перыяд, г.зн. з прыходам частак Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь і да канчатковага ўстанаўлення на гэтай тэрыторыі органаў савецкай улады.

**Літаратура**

1. Карпенкина, Я. В. Советизация еврейского населения Западной Белоруссии (1939–1941 гг.) : дисс. …канд. ист. наук : 07.00.02 / Я. В. Карпенкина ; НИУ ВШЭ. – Москва, 2018. – 259 с.

2. Обращение Временного управления ко всем гражданам // НАРБ. – Ф. 4п. – Воп. 1. – Спр. 14515. – Арк. 8.

3. Органы государственной безопасности СССР в Великой Отечественной войне : Сборник документов. Том I. Накануне (ноябрь 1938 г. – декабрь 1940 г.). – М. : Книга и бизнес, 1995. – 451 с.

4. Рижский мир в судьбе белорусского народа. 1921–1953 гг. В 2 кн. Кн. 2. / Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т. истории ; редкол.: А. А. Коваленя [и др.]. – Минск : Беларуская навука, 2014. – 335 с.

5. Толочко, Д. М. Формирование органов государственного управления в Западной Беларуси осенью 1939 г. // Известия Гомельского государственного университета имени Ф. Скорины. – 2011. – № 5. – С. 132–136.

6. Харченко, О. П. Кадровая политика ЦК ВКП(б) по созданию и формированию аппарата управления в западных областях Беларуси / О. П. Харченко // 1939 год у лёсе беларускага народа : зб. мат. рэг. кр. ст. / БрДУ імя А. С. Пушкіна ; рэдкал. В. Р. Швайко [і інш.]. – Брэст, 2010. – С. 126–131.